■ Будзь у курсе!

Дазвол на зброю будуць падаўжаць толькі па меддаведцы

Падоўжыць тэрмін дзеяння дазволу на захоўванне і нашэнне грамадзянскай зброі можна будзе толькі пры прад'яўленні медыцынскай даведкі аб стане здароўя.

Адпаведнае палажэнне змешчана ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №21 ад 20 студзеня. Новая заканадаўчая норма ўступіць у сілу 26 красавіка, паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.

Для выяўлення людзей, якія маюць супрацьпаказанні да валодання зброяй з-за стану здароўя, супрацоўнікі органаў унутраных спраў не менш як два разы на год накіроўваюць запыты на праверку па псіханеўралагічным і наркалагічным уліках у адпаведныя медыцынскія ўстановы. Аднак медработнікі адмаўляюць у прадастаўленні інфармацыі, правамерна спасылаючыся на ўрачэбную тайну. Такім чынам, па-за ўвагай праваахоўнікаў застаюцца ўладальнікі зброі, чыё фізічнае і псіхічнае здароўе з часам істотна змянілася. Новаўвядзенне дазволіць выправіць сітуацыю і своечасова ануляваць дазволы на зброю для грамадзян, якім стала проціпаказана валодаць ёй.

Згодна з заканадаўствам, захоўваць зброю і боепрыпасы могуць юрыдычныя і фізічныя асобы, якія атрымалі ў органах унутраных спраў дазвол, тэрмін дзеяння якога складае тры гады з дня выдачы і можа быць прадоўжаны па заяве ўладальніка яшчэ на тры гады.

МУС таксама нагадвае, што органы ўнутраных спраў маюць права правяраць умовы захоўвання зарэгістраванай зброі па месцы жыхарства яе ўладальнікаў.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Песню бярыце з сабою

СЦЮЖА. ЧАКАЕМ СОНЕЙКА

Сярэдзіна лютага. Зіма ў самым разгары са сваімі маразамі і адлігамі, мяцеліцамі і сцюжамі, але дзень ужо трохі павялічыўся, і нам хочацца вясенняга ласкавага сонейка. Гэты настрой адчуваецца ў песні вядомага сучаснага беларускага кампазітара Дзмітрыя Даўгалёва на вершы Уладзіміра Пецюкевіча «Ой, зіма, зіма». Аўтарамі спачатку была напісана песня «А ты кажаш: вясна», якую цудоўна выканаў выдатны спявак Валерый Дайнэка. Гэта і натхніла кампазітара і паэта на стварэнне цыкла песень «Поры года». У яго ўвайшлі таксама песні «Не спяшайся, восень», «Ой, зіма, зіма» і «Лета».

ОЙ, ЗІМА, ЗІМА

верш У. Пецюкевіча
музыка Д. Даўгалёва

Ой, зіма, зіма беласнежная,
Светлых сноў маіх ты не разганяй! —
Хай прысніцца мне сонца весняе,
Хай асвеціць мой запаветны край.

Запаветны край — салаўіны гай
І дарога ўдаль у вянку бяроз.
Запаветны край — белы-белы май
І каханых воч сіні-сіні плёс.

Ой, зіма, зіма беласнежная,
Сцежачкі маёй ты не замятай! —
Хай бяжыць яна, летуценная,
І вядзе мяне ў запаветны край.

Запаветны край — зорны небакрай,
Незямная даль, вечная вясна.
Запаветны край — як нябесны рай,
Дзе пяе штодня Божая струна.

Ой, зіма, зіма беласнежная,
Мне журбы-тугі ты не навявай! —
Дні халодныя не бязмежныя,
Абдыму я зноў запаветны край.



Рубрыку вядзе кампазітар Уладзімір КАРЫЗНА

■ Філатэліст

На марках — нацыянальныя промыслы

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 17 лютага выпусціла ў абарачэнне новыя паштовыя маркі з эмблемай Рэгіянальнай садружнасці ў галіне сувязі. Гэтым разам яны прысвечаны беларускім промыслам — «Саломапляценню» і «Ганчарству».

Праект падрыхтаваны па матэрыялах, сабраных у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Дызайн Таццяны Кузняцовай. Намінал маркі «N» адпавядае тарыфу на перасылку міжнароднай простай паштовай карткі, не прыярытэтнай. Намінал маркі «Н» адпавядае тарыфу на перасылку міжнароднай простай пісьмовай карэспандэнцыі (пісьмаў, бандэроляў, дробных пакетаў) масай да 20 г, не прыярытэтнай.

У дзень выпуску марак на паштамце сталіцы праводзілася спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень»

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.22	18.25	10.03
Віцебск —	8.15	18.12	9.57
Магілёў —	8.13	18.15	10.02
Гомель —	8.06	18.15	10.09
Гродна —	8.37	18.41	10.04
Брэст —	8.34	18.45	10.11

Месяц

Апошняя квадра. Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Агаф'і, Макара.*
К. *Канстанцыі, Альберта, Максіма, Сымона.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

На экзамене па філасофіі прафесар задаў толькі адно пытанне студэнтам: «Чаму?»

Найвышэйшы бал атрымаў студэнт, які даў адказ: «А чаму б і не?»

— Вы такая бледная... Вас трэба паказаць урачу.

— Не, мяне трэба паказаць мору.

Наглядзеўшыся эротыкі, угаварыў дзяўчыну прыняць разам душ.

Дваццаць хвілін стаяў звонку і падаваў ёй розныя шампуні.

Ён:

— Дарагая, дзе мая вячэра?

Яна:

— У кнізе рэцэптаў, старонка 29!

Пазнаёмлюся з цікавай жанчынай для сур'ёзных адносін.

А не, не пазнаёмлюся... Жонка ўжо вярнулася з крамы.

Малюнак Аляксандра ШМІТА.

Даты Падзеі Людзі

18 ЛЮТАГА

1892 год — нарадзіўся (в. Цупер, цяпер у Жлобінскім раёне) Максім Пятровіч Скрыганаў, контр-адмірал. З 1913 года на Балтыйскім, Паўночным і Ціхаакіянскім флатах. З 1938-га — камандзір брыгады караблёў Ціхаакіянскага флоту. Вызначыўся пры адбіцці японскай агрэсіі на возеры Хасан. У Вялікую Айчынную вайну — старшы марскі начальнік гарнізона Махачкалы, адначасова, з верасня 1939 года па чэрвень 1945-га і з мая 1946-га, — камандзір Ленінградскага вучэбнага атрада падводнага плавання. У чэрвені 1945-га — красавіку 1946 года — камандзір атрада падводных караблёў ВМФ. Памёр у 1951 годзе.

1895 год — нарадзіўся Сямён Канстанцінавіч Ціматшэнка, савецкі военачальнік, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза. У 1940—1941 гадах — наркам абароны СССР. У Вялікую Айчынную вайну — старшыня Стаўкі Галоўнага камандавання (1941), член Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання (1941—1945), намеснік наркама абароны. У 1945—1960 гадах — камандуючы войскамі шэрагу ваенных акруг. Памёр у 1970 годзе.

1922 год — нарадзіўся (в. Звянячы Талачынскага раёна) Міхаіл Андрэевіч Савіцкі, беларускі мастак, педагог, народны мастак Беларусі, народны мастак СССР, акадэмік Акадэміі мастацтваў СССР, акадэмік НАН

Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, Герой Беларусі. У Вялікую Айчынную вайну — удзельнік абароны Севастопаля, быў вязнем нямецкіх канцлагераў. Працаваў у галіне станковага і манументальнага жывапісу. Аўтар карцін «Партызанская мадонна», «Дзеці вайны», «Лічбы на сэрцы» і інш. Серыю карцін мастак прысвяціў ахвярам чарнобыльскай катастрофы. Значнае месца ў яго творчасці займалі партрэты і хрысціянская тэматыка. Памёр у 2010 годзе.

1935 год — нарадзіўся (г. Сан-Антоніа, Чылі) Сяргей Альбертавіч Картэс, кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны артыст Беларусі. У 1991—2002 гадах — дырэктар — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Рэспублікі Беларусь. Сярод твораў: оперы «Джардана Бруна», «Матухна Кураж», «Візіт дамы», араторыі, уверцюры, вакальныя цыклы, музыка да драматычных спектакляў, кіна- і тэлефільмаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2016 годзе.

Было сказана

Янка СІПАКОЎ, паэт, празаік:
«Таму і смутак нам патрэбен,
Каб радасць большаю была».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 685.
Нумар падпісаны ў 19.30 17 лютага 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12